# Куфар паехаў у Маскву

**Вынікі V Міжнароднага фестывалю студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар-2008» падведзены.**



Праграма выніковага фестывальнага дня была не менш насычаная, чым у дні паказаў. Адкрыла яе доўгачаканая прэзентацыя першага зборніка п'ес у серыі "Бібліятэчка "Тэатральнага куфра" БДУ". У яго ўвайшлі пяць твораў маладых беларускіх драматургаў: Дзіяны Балыкі, Андрэя Бібікава, Таццяны Ламонавай, Мікалая Руткоўскага, Марыі Савельевай. Выдаўцы спадзяюцца, што гэтыя п'есы знойдуць сцэнічнае ўвасабленне на будучых фестывалях і мяркуюць працягнуць серыю ў наступным годзе зборнікам замежнай драматургіі. Аднаго з аўтараў называюць ужо цяпер — Арцюр Адамофф.

Перад цырымоніяй закрыцця гледачам дэманстравалі вынікі сваёй працы ўдзельнікі майстар-класа "Koufar-in-motion". За чатыры дні рэжысёр Сяргей Кулікоўскі і інтэрнацыянальная студэнцкая трупа зрабілі пастаноўку паводле п'есы У.Шэкспіра "Рамэо і Джульета" і дакументальных інтэрнетаўскіх спрэчках пра каханне.

На закрыцці фестывалю яго ўдзельнікаў чакаў сюрпрыз. Старшыня журы Жан-Марк Лару адзначыў досыць высокі ўзровень "Тэатральнага куфра": 12 спектакляў з 19 былі вартыя таго, каб атрымаць галоўны прыз. І журы пашырыла спіс намінацый, каб узнагародзіць усе таленты.

Больш за ўсіх дыпломаў сабраў спектакль "Апельсіны ў падарунак" паводле п'есы Э. Шміта "Оскар і ружовая паненка" народнага літаратурнага тэатра БДПУ імя М. Танка "Жывое слова": за лепшую сцэнаграфію, лепшае музычнае афармленне і лепшую мужчынскую ролю (акцёр Раман Шарапінскі). Два дыпломы атрымала пастаноўка "Бакалаўры сэрцаў" тэатра "Event Production" (Германія): за лепшую жаночую ролю другога плана (Марыяна Граф) і лепшы акцёрскі ансамбль. Пераможцам Інтэрнет-галасавання стаў спектакль "Вяртанне да таго, што прайшлі" паводле твораў Д. Рубінай народнага музычнага тэатра БДУ "На філфаку", а яго актрыса Марыя Хадзінская атрымала ўзнагароду за лепшую жаночую ролю. Яшчэ адзін дыплом у гэтай намінацыі дастаўся Святлане Латышавай з народнага студэнцкага драматычнага тэатра БДУ "На балконе" (спектакль "Зацюканы апостал" паводле А. Макаёнка).

Інаватарам і арыгіналам фестывалю прызналі Мікалая Руткоўскага за пастаноўку яго ж уласнай п'есы "Жанчыны Бергмана" ў тэатры "На балконе". Канстанцін Гесь ганараваны як лепшы выканаўца мужчынскай ролі другога плана (тэатр "7 паверх" БДУ культуры і мастацтваў, спектакль "Чайка" паводле А. Чэхава).

Адзін з самых галоўных дыпломаў — за лепшую рэжысёрскую работу — уручылі Калеву Куду са студэнцкага універсітэцкага тэатра г. Тарту (Эстонія) за спектакль "Псіхоз 4.48" паводле п'есы С. Кейн...

Лёс Гран-пры на гэтым фестывалі вырашаюць гледачы. І звычайна вынікі галасавання адрозніваюцца ад меркаванняў журы. Але сёлета густы журы і гледачоў супалі. Спектакль "Сірано" паводле п'есы Э. Растана студэнцкага тэатра Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта быў прэтэндэнтам на дыплом ў васьмі намінацыях, і ўрэшце быў адзначаны спецыяльным прызам журы. "Сірано" стаў пераможцам і паводле галасавання гледачоў. Так што сёлета тэатральны куфар, які тры гады запар заставаўся ў Беларусі, паехаў у Маскву.

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ**

***На здымку: фестывальны "Трамвай жаданняў" і яго пасажыры.***

***Фота Дзмітрыя Смялова***